**Н.У. Зарэцкая (Мінск)**

## Эпітэт у творах Янкі Купалы і яго ўплыў на індывідуальны стыль пісьменніка

Для аналізу невыпадкова ўзяты вершы, напісаныя Янкам Купалам на працягу 1910–1912 гадоў, дакастрычніцкія паэмы (“Курган”, “Бандароўна”, Магіла льва”, “Яна і я”, “На куццю”), бо менавіта ў гэтых творах аўтар найбольш поўна выявіўся як паэт-рамантык. Ужо ў першых зборніках Янкі Купалы, на фоне іх масава-сялянскіх матываў і песенна-фальклорнай стылістыкі, вырастала рамантычная, па сутнасці, постаць паэта. Гэта постаць мела ў Купалы пэўнае развіццё. Яшчэ моцна звязаная з бытам, з практычным жыццём мільёнаў у “Жалейцы”, прыкметна вылучаная з масы ў “Гусляры”, яна набывае ў вершах 10-х гадоў выключнае значэнне. Рана праявілася своеасаблівая для рамантызму характэрная цікавасць Купалы да ўзятага з міфалогіі і фальклору фантастычнага элементу, да форм народнай дэманалогіі.

Неабходна падкрэсліць уласцівую Я. Купалу рысу, якая спакваля рыхтавала яго гатоўнасць сустрэцца з высокім рамантызмам і арганічна яго асвоіць. Маюцца на ўвазе асаблівасці стылёвага, спецыфічна-моўнага мыслення Купалы. Паслядоўны рэаліст, які заўсёды ўмеў праз вобразы гранічнай жыццёвай канкрэтнасці раскрываць грамадскія супярэчнасці часу, Янка Купала часта заставаўся рамантыкам *на ўзроўні слова*, у прынцыпах свайго падыходу да слова і ягонага скарыстання ў вобразным і эмацыянальным кантэксце верша.

Ужо ў зборніку “Жалейка” малады Янка Купала ўжывае шмат якія стылёвыя і рытміка-інтанацыйныя прыёмы, упершыню адкрытыя рамантыкамі. Смеласць і навізна прыёмаў кідаюцца ў вочы тым больш, што часам звернуты яны да самых простых і празаічна-будзённых рэчаў і з’яў.

Пра Зольку (1906): “Над ёй сінее неба і сее непрыветы...”; яна “пацешыцца, як птушкі пяюць вясной агнісце; жалобу жаляў носіць, як раздзяецца з лісцяў”. Словы тут звязваюцца паміж сабою не столькі законам сэнсава-лагічнай залежнасці, колькі эмоцыяй, настроем, тонам. Актыўнае лірычнае пачуццё паэта нанава творыць прыродны свет, пераносячы рэчавую адзнаку аднаго, галоўнага, прадмета на другі, атрыбутыўны: прыметнік (агністы, агністая) зрабіўся прыслоўем (агнісце, агніста). І ўжо птушкі “пяюць агнісце”, хоць агністай прызначана быць, і то пры адпаведным узнёслым стане душы, толькі вясне, а ніяк не голасу птушкі.

Лагічнае значэнне слова адступіла, пакінуўшы настрой і ацэнку, і ў такім Купалавым неалагізме, як “непрыветы” (дождж, град?). Суб’ектыўна-ацэначнае згушчана праз паўтор сінанімічнага слова-настрою, слова-эмоцыі:

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

“жалоба жаляў”. Унутранае сугучча (“сінее неба і сее непрыветы”) павінна падкрэсліць надзвычай важную для Купалы ролю гукавога эфекту, які нярэдка (асабліва ў творах пазнейшага часу) уздзейнічае як бы “наперад” слова.

Ужо ў вершах 1906–1907 гадоў Купала адводзіць апорнае месца ў стылістычнай сістэме ***эпітэту*** – ударнаму, моцнаму, такому, што і не заўсёды падпарадкоўваецца прадмету: *Як пайду я, пайду па загонах, / Па* ***мазольным*** *аратых сляду*; *Вымкну я птушкаю з думкай* ***пралётнаю***. Азначэнне “пралётная” адарвалася ад птушкі, стаўшы прыкметай чалавечай думкі, вобразна прыпадобненай да крылатай птушкі. Янка Купала піша: *Досыць гніць у сне* ***марным, ланцужным.*** Інтэнсіўны эпітэт з вялікай сілай выказвае непрыняцце паэтам грамадскай пасіўнасці. *У малітве ляглі бы ўсе справы, / Якія стварае* ***крывавы*** */ Наш быт у жыццёвым пакосе...* У гэтых радках звяртае на сябе ўвагу эпітэт “крывавы”, які хутчэй бы падышоў да азначэння пакосу, чым быту. І тым не менш гэты вельмі актыўны эпітэт характарызуе людское жыццё, збіраючы вакол сябе верш, яго эмоцыі і настрой.

На другім этапе Купалавай творчасці прыкметна згусціліся рамантычна-экспрэсіўныя фарбы ягонай мовы. Непаўторнасцю, сэнсавай насычанасцю, экспрэсіўнасцю вызначаюцца ў Купалавых творах эпітэты.

Вось пачатак паэмы ”Курган”:

Паміж пустак, балот беларускай зямлі,
На ўзбярэжжы ракі шумнацечнай,
Дрэмле памятка дзён, што ў нябыт уцяклі, –
Ўдзірванелы курган векавечны.
Дуб галлё распусціў каранасты над ім... [1, с. 51]

Паэма напісана ў форме сказа-легенды. Спакойна і велічна апавядае паэт пра мінулае роднага беларускага краю, знаходзіць адпаведныя эпітэты: *шумнацечная* (рака), *удзірванелы, векавечны* (курган), *каранасты* (дуб).

Трапныя эпітэты, якія характарызуюць князеў палац, самога князя – сілу, грозную, недаступную і жорсткую: *Белы хорам стаяў* ***недаступнай*** *сцяной, грозна, думна глядзеў на прыволле. Князь у хораме жыў,* ***слаўны*** *свету ўсяму,* ***недаступны і грозны****, як хорам*. Двойчы паўтараецца эпітэт недаступны, які характарызуе розныя прадметы: недаступная сцяна, недаступны князь. Хорам параўноўваецца са сцяной, і параўнанне гэта ўзмацняецца эпітэтам-паўторам. Звяртае на сябе ўвагу эпітэт *слаўны* (князь). Слова *слаўны* звычайна ўжываецца са значэннем “той, хто карыстаецца вялікай заслужанай славай, пашанай”. Аднак Купала пераасэнсоўвае гэты эпітэт: князь слаўны, вядомы свету жорсткасцю, бесчалавечнасцю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Дакладныя ў паэме эпітэты, якія характарызуюць падданых князя і ўсё, што акружае яго недаступны, грозны палац: *У нагах у яго рассцілаўся абшар хвоек гонкіх і пахані чорнай,* ***сонных*** *вёсак шары, хат* ***амшалых****, як мар, хат з сям'ёй душ* ***падданых, пакорных***.

Эпітэты ў творах Янкі Купалы неаднародныя паводле сваёй функцыі, стылёвай афарбоўкі. Паводле функцыі выдзяляюцца *паясняльныя* і *метафарычныя* эпітэты, паводле стылістычнага выкарыстання – *агульнамоўныя* і *аўтарскія****,*** *аказіянальныя* (наватворы).

*Паясняльныя эпітэты* – такія мастацкія азначэнні, якія падкрэсліваюць у прадмеце, з'яве адметнае, характэрнае, тое, што вылучае гэты прадмет ці з'яву сярод іншых. Паясняльны эпітэт часта становіцца цэнтрам фразы, радка, нясе асноўную сэнсавую і эмацыянальную нагрузку.

У паэме "Бандароўна" з глыбокім спачуваннем гаворыць паэт пра мужную, гордую Бандароўну, якая нічым іншым не можа адпомсціць пану , як толькі кінуць яму ў вочы словы гневу і нянавісці. Перадае гэта Я. Купала наступнымі эпітэтамі: *Ў вачах толькі рдзяцца слёзы, як улетку росы. Ці то слёзы з крыўды* ***страшнай****, ці з* ***бяссільнай*** *злосці* [1, с. 72]. Ужывае паэт паясняльныя эпітэты і для характарыстыкі пана і яго дружыны: *хеўра лядачая, дух* ***злы****, слава* ***бясчэсная****, пагоня* ***дзікая***. Характарыстыку назоўнікаў (хеўра, дух, пагоня, слава) дапаўняюць, узмацняюць вобразныя азначэнні – эпітэты: *Да сягоння жыве памяць аб* ***злым*** *гэткім дусе на ўсёй чыста Украіне і на Беларусі;. Як пачуў ён у карчомцы зычную забаву, туды йдзе сваю* ***бясчэсну*** *паказаці славу; Прыблукаўся пан Патоцкі з хеўраю* ***лядачай;*** *Наляцела, адшукала* ***дзікая*** *пагоня*.

Не менш трапныя паясняльныя эпітэты ў паэмах "Курган" і "Магіла льва": *Не часалі дамоўкі яму сталяры, не заплакалі* ***бліжнія*** *вочы; Водклік б'ецца ад струн на* ***сцюдзёных*** *сцянах; Пацяшаешся белым, чырвоным віном, – гэта слёзы нядолі* ***сірочай;*** *Душы і сэрцайка такога, і той* ***бязмернай*** *дабраты шукаці хіба толькі ў бога; Каханне –* ***лёгкая*** *прынада для сэрцаў* ***чуткіх, маладых****; Няхай той час, што згінуць мусіў У* ***беспрасветнай*** *векаў мгле, для* ***беспрыпыннай*** *Беларусі хоць толькі ў песнях ажыве*.

Напрыклад, эпітэт *бліжнія* ў Я. Купалы ў спалучэнні з назоўнікам вочы абазначае вочы сваякоў, братавы, сестрыны вочы. Гусляр адзінокі, бо па ім не заплача ні брат, ні сястра – наогул блізкі чалавек.

Характэрная асаблівасць рамантычных паэм Я. Купалы – іх алегарычнасць, багацце падтэксту, чым, мабыць, і тлумачыцца частае ўжыванне слоў з пераносным значэннем. Змястоўныя, разнастайныя асацыяцыямі купалаўскія метафары. Неад'емная частка іх – *метафарычныя эпітэты*, якія ўзмацняюць вобразнасць апісання, робяць яго непаўторным,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

свежым: *Сонца днём распускае там косы свае, ночкай зоры глядзяць **залатыя;** Штодзень расце Машэка ў славу, расце з **крывавага** жніва; Вецер стогне над ім уздыханнем **глухім;** Ты адважыўся мне на **сляпы** перакор вызваняці сусветныя трэлі; З **дзікім** смехам учапіліся за косы і рукі;. Кажуць, толькі як выйдзе і ўдарыць як ён па струнах з **неадступнаю** песняй, – сон злятае з павек; Гэта сэрцаў **скамененых** пламень.*

У рамантычных паэмах Я. Купалы метафарычныя эпітэты ныбываюць рысы своеасаблівай велічнасці, эпічнасці, узмацняюць драматызм, эмацыянальную напружанасць: *незвычайны агонь у **задумных** вачах, заплакалі струны **жывыя**.*

Матэрыялам для паэм Я. Купалы сталі народныя песні, казкі, легенды, паданні. Таму натуральна і зразумела частае ўжыванне Купалам *сталых (пастаянных эпітэтаў).* Сталыя эпітэты спалучыліся ў народнай творчасці з тым ці іншым словам даўно і на працягу стагоддзяў пераходзяць з песні ў песню як гатовыя паэтычныя адзінкі, амаль не абнаўляючы свайго вобразна-сэнсавага значэння. На гэтай падставе некаторыя лінгвісты такія азначэнні не лічаць эпітэтамі. У творах пісьменнікаў яны ўжываюцца ў асноўным тады, калі мастак свядома арыентуецца на фальклор, будуе свае творы на фальклорным матэрыяле. Сталыя эпітэты ў лінгвістычнай літаратуры нярэдка называюць традыцыйнымі, народна-паэтычнымі, бо прыйшлі яны ў літаратурную мову з вуснай народнай творчасці. Асноўная рыса сталых эпітэтаў – абмежаванасць спалучэння з паяснёным словам: чорныя бровы, буйныя ветры, чыстае поле, сіняе мора і інш.

У творах Я. Купалы сустракаем такія сталыя эпітэты, як *дзень ясны, бераг круты, зямля сырая, ноч цёмная, кроў чырвоная, гарачая, ручкі белы, бровы чорны, бярозка бела, бітва крывава, лес цёмны, доля горкая, дол глыбокі* і інш. *На **сырой** прыляж зямельцы, атуліся касою, няхай сэрцайка дзявоча прыйдзе да спакою; Спахмурнелі **чорны** бровы, заіскрыліся вочы; Не прадчувала **горкай** долі, якую лёс людзям нашле; **Крывавы** суд тварыў Машэка; Лес **цёмны** з ветрам гаманіў; Капалі ў пушчы дол **глыбокі**, дно высцілалі ў кару, і насып сыпалі **высокі** – Машэку насып, як цару.*

Сталыя эпітэты ў паэмах Я. Купалы, як правіла, стаяць пасля паяснёнага назоўніка. Напрыклад, у паэме "Бандароўна": ***Ручкі белы** заламала, звесіла галоўку; Уцякай жа за пагодай, **Донька маладая**, пoкі **дзень** засвеціць **ясны**, покі сіл хапае; Палілася **кроў чырвона**, сэрца абамлела, павалілась на зямельку, як **бярозка бела**.*

Янка Купала ўтварыў нямала новых слоў і зваротаў у адпаведнасці з моўнымі традыцыямі і законамі нашай мовы. Купалаўскія наватворы арганічна ўваходзяць у сістэму лексікі паэта, у сістэму беларускай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

літаратурнай мовы. У паэмах Янкі Купалы нямала аўтарскіх эпітэтаў-наватвораў, якія надаюць арыгінальнасць купалаўскаму стылю. Вось радкі з паэмы “Курган”: *Скурганіў бы душу чырванцом тваім я*. Скурганіць душу – значыць зрабіцца нячулым, глухім да гора і бяды тых, каму служыць песня гусляра. Ад дзеяслова *скурганіць* паэт утварае дзеепрыметнік *скурганены* “змярцвелы, нежывы, нячулы”, які сустракаецца ў іншых творах Купалы ў якасці эпітэта.

Пра незвычайную здольнасць паэта адчуваць і разумець роднае слова гавораць такія аўтарскія эпітэты, як *задумныя вочы, невыдумная світка, непанятлівае слова, абнядолены народ, скочная музыка, ніўныя сялібы, жаласняная песня, шумнацечная рака* і інш.: ***Невыдумная** світка – убор на плячах; Незвычайны агонь у **задумных** вачах; На гуслярaвым наспе жвыровым палыны ўзышлі, вырас дуб малады, зашумеў **непанятлівым** словам; Люба чуці табе **скочнай** музыкі звон; Прывяла гусляра з яго **ніўных** сяліб дворня князева ў хорам багаты*. Часам Янка Купала нязвыкла спалучае вядомыя словы, і ствараюцца вельмі вобразныя і свежыя эпітэты: *канапляная заплата, сівыя вочы. Не пад мысль песня будзе каму-небудзь нам – **канапляную** возьмеш **заплату**; Гэтак слухае, выслухаў князя гусляр, заіскрыліся **вочы сівыя***.

Вельмі часта ў вершах і паэмах Янка Купала ўжывае *эпітэты-прыдаткі*. Выражэнне прыкметы прадмета з дапамогай прыдатка ўласціва і народнай моватворчасці. Такія эпітэты дакладна, трапна, ёміста характарызуюць паяснёнае слова: *вяселле-разгул, гуслі-баі, песня-дума, дудар-званар, гусляр-старына, пацеха-забава, хорам-астрог, княжа-ўладар* і інш. *На **вяселле-разгул** наплыло, як на сход; На калені ляглі **гуслі-баі**; **Песня-дума** за сэрца хапала; Вакол гэтай думы **дудара-званара** казак дзіўных злажылась нямала; Загадаў ён пазваць **гусляра-старыну**; Ажно трэцяга дня князь прыдумаў адну для дружыны **пацеху-забаву**; Ты збялеў, ты дрыжыш, слаўны **княжа-ўладар**; **крыўда-ведзьма** нашых межаў; А ты, **хмарка-імгла**, мне нуду развяла; Цені-сеткі снуюць, **песню-змову** пяюць; З **ветрам-сокалам** душы заручым*.

Як працяг фальклорных традыцый у паэмах Я. Купалы трэба разглядаць эпітэты, выражаныя кароткай ці ўсечанай формай прыметнікаў: ***нявідзіма** рука*, *косы **буйны***, *грудзі **белы***, ***няшчасна** Бандароўна* і інш.

Экспрэсіўны, эмацыянальны, суб’ектыўны эпітэт – яркая асаблівасць стылю Янкі Купалы: *восень **панурая, магільная***, *похмур **лядачны, крывавы***, ***дзікі** рогат*, ***глухое** прыволле*, ***грозны, расахаты** дуб*, ***неўгамонны, расходзісты** звон*.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Пераважная большасць эпітэтаў у творах Я. Купалы выконвае не так пазнавальна-ацэначную, як эмацыянальна-настраёвую, экспрэсіўную функцыю. Яны ўключаюцца ў агульную сістэму выяўленча-вобразных сродкаў, узаемадзейнічаюць з імі, падпарадкоўваюцца агульнаму аўтарскаму заданню: так, напрыклад, Купала стварае надзвычай эмацыянальную, казачную атмасферу ў вершаванай казцы “Чараўнік”: *Ад рукі сына першага вісельні гнуцца, ў зямлю йдуць маладыя галовы. Захапіў яго* ***похмур лядачны, крывавы****, жалязянымі клешчамі сціснуў; З зор сатканы былі* ***недасяжныя сцены*****.**

Для твораў Я. Купалы характэрна ўласцівая рамантызму антанімічная апазіцыя эпітэтаў, якія абазначаюць светлыя, яркія колеры – і цёмныя, змрочныя. На адным полюсе словы: белы, светлы, яркі, дзень, бляск, сонца..; на другім – чорны, цёмны, шэры, змрок, ноч... У змястоўна-эстэтычным плане дамінуючая рыса гэтага кантрасту – сімвалізацыя ўзвышанага, дарачага радасць, асалоду, і нізкага, што прыносіць пакуты: *сумная мгла*, *мрок нямы*, *цёмная крыніца*, *чорная гульня*, *дзікая ноч*, *шлях чорны* – і *сонца залацістае*, *светлая праўда*, *свет белы*, *ясны дзень*, *шчаслівыя сонечныя іскрыны*, *ясната яскравая*, *агністая зара*. Звернем увагу на частае ўжыванне эпітэта “агністы” ў творах Я. Купалы: *Абнімі ты мяне, маладая,* ***абніманнем*** *гарачым,* ***агністым;*** *Пад* ***агністай зарой*** *над сівым курганом заручаліся з ёй туманом і агнём*. Гэты эпітэт і вышэй згаданыя эпітэты, што абазначаюць кантрастныя колеры, ствараюць асаблівую, узнёслую настраёвасць у творах, выяўляюць рамантычнае светаадчуванне паэта.

Літаратура

1. Купала, Я. Поўны збор твораў : у 9 т. – Т. 1. – Мінск : Маст літ. – 1995.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ